УДК 821.161.3-312.4

Вуч. Г.А. Цяльнова, А.А. Фядзечка
Навук. кір. Н.М. Шаламіцкая, настаўнік беларускай мовы
і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
(ДУА "Сярэдняя школа № 1 г. Пінска")

# АПОВЕСЦЬ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА "ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ КАРАЛЯ СТАХА": АД КЛАСІКІ ДЭТЭКТЫЎНАГА ЖАНРУ ДА НАВАТАРСТВА

**Тэма даследавання**: "Аповесць Уладзіміра Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха": ад класікі дэтэктыўнага жанру да наватарства".

У.Караткевіч – адзін з тых таленавітых пісьменнікаў, каму ўдалося абудзіць масавую цікавасць да літаратуры, звярнуўшыся да жанру гістарычнага дэтэктыва. Тэма па **актуальнасці** займае значнае месца, таму што дэтэктыў быў і застаецца адным з найбольш дыскусійных і нявывучаных жанраў у літаратуразнаўстве. Аналіз аповесці павінен падвесці да адказу на пытанні: "Што такое сучасны дэтэктыў? Якім ён павінен быць, каб не страціць чытацкай цікавасці? Якім шляхам ісці аўтарам дэтэктываў: тым, што акрэслілі заснавальнікі класічнага дэтэктыва, ці шукаць новыя, арыгінальныя метады?"

**Мэта даследавання** – выяўленне праз жанравую характарыстыку дэтэктыўнай аповесці "Дзікае паляванне караля Стаха" класічнага і наватарскага ў творы.

Дасягненне пастаўленай мэты патрабуе вырашэння наступных **задач:**

– вызначыць паняцце і асаблівасці дэтэктыўнага жанру, даць класіфікацыю дэтэктыўных твораў, выявіць каноны пабудовы класічнага дэтэктыва і асноўныя прыёмы жанру;

– раскрыць прычыну звароту У. Караткевіча да жанру гістарычнага дэтэктыва;

– выявіць адпаведнасць твора класічным канонам дэтэктыва і акрэсліць наватарства У.Караткевіча ў распрацоўцы жанру дэтэктыва ў беларускай літаратуры;

– прааналізаваць асаблівасці выкарыстання аўтарам асноўных прыёмаў дэтэктыўнага жанру.

**Практычнае значэнне даследавання.** Матырыялы і вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны настаўнікамі і вучнямі як пры падрыхтоўцы да ўрокаў па творчасці У.Караткевіча, так і пры

вывучэнні сучаснага беларускага дэтэктыва. Прааналізаваныя прыёмы павінны зацікавіць тых, хто спрабуе свае сілы ў напісанні твораў дэтэктыўнага жанру. Аспекты работы могуць стаць аб'ектам новых даследаванняў.

**Аб'ект даследавання** – аповесць "Дзікае паляванне караля Стаха".

**Прадмет даследавання** – асаблівасці дэтэктыўнага жанру ў аповесці "Дзікае паляванне караля Стаха".

Пры правядзенні даследавання аўтарамі выкарыстоўваліся наступныя **метады:** параўнальна-супастаўляльны, псіхалагічны, біяграфічны.

**Структура работы**. Даследаванне ўключае ў сябе ўводзіны, тры главы, заключэнне, дадаткі і спіс выкарыстаных крыніц.

У ходзе работы пастаўленая мэта дасягнута, а задачы вырашаны.

У першай главе даследавання мы прыйшлі да высновы: сёння ў свеце назіраецца наступленне крызісу чытання, што з'яўляецца сур'ёзнай праблемай. На гэтым фоне ўзмацняецца каштоўнасць такога жанру, як дэтэктыў, таму што ён цікавы чытачам рознага ўзросту. Намі разгледжаны прыкметы, асаблівасці і кампазіцыя дэтэктываў, а таксама каноны, па якіх ствараліся класічныя дэтэктывы. У другой главе паказана прычына звароту У.Караткевіча да жанру гістарычнага дэтэктыва. Прааналізаваўшы ў трэцяй главе адпаведнасць аповесці канонам класічнага дэтэктыва, а таксама дэтэктыўныя прёмы, выкарыстаныя аўтарам, прыйшлі да высновы, што Караткевіч па-майстэрску пераплёў разнастайныя прыёмы і гэтым дамогся таго, што чытач знаходзіцца ў напружанні да апошняй старонкі аповесці, імкнучыся разам з героямі разблытаць усе таямніцы і прайсці захапляльны шлях "ад цьмы да святла".

У час працы над тэмай мы праверылі наступную **гіпотэзу**: наватарства дэтэктыўных твораў Караткевіча ў тым, што праз твор, аснова якога – інтрыга, аўтар імкнуўся не толькі павысіць цікавасць моладзі да чытання, але і выхоўваць чытача праз асэнсаванне гістарычнага мінулага.